

У МІНСК ПРЫЕХАЎ ДАЛІ! **9**

РАЙ? ЁН ТУТ, НА ЗЯМЛІ... **11**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 САКАВІКА 2019 г. СУБОТА № 50 (28917)

# ІХ РАДЗІМА, ІХ ДОМ — БЕЛАРУСЬ



Фота БелТА.

**У Дзень Канстытуцыі Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў пашпарты 25 вучням сярэдніх школ і гімназій. Упершыню гэта падзея адбылася ў Палацы Незалежнасці.**

«Гэтае свята, якое мы адзначаем ужо не першы год, асаблівае. І вы ведаеце чаму. Таму што сёння мы адзначаем 25-годдзе Асноўнага Закона нашай краіны і з гэтай нагоды найлепшым з найлепшых уручаем пашпарты грамадзян Рэспублікі Беларусь. Вы становіцеся законнымі, самымі паўнапраўнымі, самымі сапраўднымі грамадзянамі нашай краіны», — падкрэсліў беларускі лідар.

Пашпарты з рук кіраўніка дзяржавы атрымалі тыя, хто ў свае 14 гадоў ужо дабіўся вялікіх поспехаў у вучобе, спорце, грамадскім жыцці, стаў гонарам бацькоў, а значыць — гонарам нашай краіны, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. І сімвалічна, што ў той год, калі яны з'явіліся на свет, маладой беларускай дзяржаве таксама споўнілася роўна 14 гадоў.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Рыгор ШЛЫК, начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«У адпаведнасці з патрабаваннямі кіраўніка дзяржавы Адміністрацыя Прэзідэнта выпрацавала сістэму мер па паляпшэнні работы са зваротамі. Асаблівая ўвага аддадзена пытанням недапушчальнасці перасылкі скаргаў зверху ўніз, а таксама шматразовай пераадрасацыі з аднаго дзяржоргана ў другі. Прынцыповы момант у гэтай рабоце — выключэнне неабгрунтаванага накіравання скаргаў таму, на каго скардзяцца. Зыходзячы з гэтага, мы сёння вядзём работу па трох асноўных кірунках: меры, накіраваныя на непасрэдны разгляд зваротаў у Адміністрацыі Прэзідэнта; меры па павышэнні адказнасці мясцовых органаў улады за разгляд першасных зваротаў; удасканаленне праграмна-тэхнічнага і іншага забеспячэння работы са зваротамі».*

## КОРАТКА

- Сёння ў Беларусі абвешчаны аранжавы ўзровень небяспекі з-за моцнага ветру. Таксама чакаецца дождж з мокрым снегам.
- **Зарэгістраванае беспрацоўе ў Беларусі складае 0,4 %.**
- Больш за 16 тысяч жыхароў Мінскай вобласці ў 2018 годзе стала сістэматычна займацца спортам.
- **Учора ў Віцебску каля крамы знайшлі гранату Ф-1 з запалам. Эвакуіравалі 15 чалавек, боезапас быў вывезены для знішчэння.**
- Звыш 600 кіроўцаў маршрутак у Гродзенскай вобласці аштрафавалі за год за парушэнні ПДР.

Сталічнае будаўніцтва

# ЧАРГА РУХАЕЦЦА... СА ШМАТДЗЕТНЫМІ

Упершыню ў горадзе адначасова будзе будавацца 15 дзіцячых садкоў



**У Мінску на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў стаяць больш за 198 тысяч чалавек — трэць ад агульнарэспубліканскай колькасці. З іх 5797 — шматдзетныя сем'і, якія маюць першачарговае права для накіравання на будаўніцтва. Як гаварылася падчас нядаўняй сустрэчы Прэзідэнта з мэрам Мінска Анатолем СІВАКОМ, аб'ёмы будаўніцтва жылля ў сталіцы будуць штогод скарачацца, пры гэтым мяркуецца актыўна развіваць гарады-спадарожнікі. Як расказала ў прэс-цэнтры БелТА намеснік старшыні камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Ірына ГОНТАРАВА, працягнецца развіццё арэнднага жылля, прапануюцца новыя падыходы да фарміравання кошту будаўніцтва жылля, прапрацоўваюцца больш гнуткія рашэнні ў дачыненні да прыватнага сектара.**

СТАР. 7

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!

Працягваецца падпіска на II квартал 2019 года

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ІХ РАДЗІМА, ІХ ДОМ — БЕЛАРУСЬ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

«Бачыць сёння вас, такіх мэтанакіраваных, паспяховых, таленавітых — дастойных дзяцей нашай суверэннай Беларусі, — шчасце, не толькі для вашых бацькоў — для ўсяго нашага беларускага народа і перш за ўсё для мяне. Для ўсіх, хто стаяў каля вытокаў стварэння незалежнай краіны, вы — самая вялікая каштоўнасць», — адзначыў ён.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў кожным з прысутных увасабляецца шматвекавая мара нашых продкаў — быць гаспадарамі на сваёй зямлі. Для ўдзельнікаў цырымоніі гэтая мара стала рэальнасцю, паколькі сёння яны вывучаюць гісторыю краіны і, напэўна, разумеюць, якое гэта шчасце — нарадзіцца і жыць у моцнай і незалежнай дзяржаве.

«Безумоўна, вы і вашы равеснікі — пакаленне новай фармацыі. І па сваім светапоглядзе вы — грамадзяне свету», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што лічбавая рэальнасць, якая стала часткай паўсядзённага жыцця падлеткаў, даўно сцёрла геаграфічныя межы і бар'еры ў зносінах, такія як адлегласць, культурныя і моўныя адрозненні. Але яны заўсёды павінны памятаць: іх Радзіма, іх дом — Беларусь. На яго думку, сувязь з роднай зямлёй, сваімі каранямі — гэта тое, што будзе заўсёды напаўняць іх жыватворнай энергіяй, даваць сілы на выкананне самых запаветных жаданняў.

«Сёння асаблівы дзень. Атрымліваючы пашпарт, вы робіце першыя крокі ў дарослае жыццё. Гэты дакумент сімвалізуе пачатак новага этапу абсалютна самастойнага жыцця, насычанага цікавымі, значнымі падзеямі. У тым ліку і палітычнымі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Пройдзе зусім няшмат часу, і вы ўжо будзеце прымаць важныя рашэнні ў гісторыі Беларусі, стаяць на варце дзяржаўных інтарэсаў. Будзеце ствараць будучыню краіны, думаць пра яе дабрабыт, пра тое, што пакінеце сваім дзецям. А значыць, зробіце ўсё магчымае, каб захаваць нашы духоўныя каштоўнасці, культурны здабытак і, самае галоўнае, мір на сваёй зямлі».

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што так і атрымаецца, што наша родная Беларусь заўсёды будзе ў надзейных руках.

«І хай пашпарт і кніга з сімвалічнай назвай «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь», якія сёння будуць вам уручыста ўручаны, стануць апорай і парадай на вашым доўгім, шчаслівым і напоўненым вялікімі справамі жыццёвым шляху», — дадаў Прэзідэнт.

Далей адбылася цырымонія ўрачыстага ўручэння пашпартоў грамадзяніна Беларусі. Потым школьнікам правялі экскурсію па Палацы Незалежнасці.

## «НАМ ПАШАНЦАВАЛА»

Як расказала журналістам вучаніца гімназіі з гарадскога пасёлка Глуск Дар'я Камінская, уражанні ад сустрэчы з Прэзідэнтам і атрымання пашпарта ў яе вельмі добрыя. «Нават словамі немагчыма апісаць. Прэзідэнт — ён такі ж, у прынцыпе, як і мы. Ён такі добры ў зносінах, вельмі прыемна было размаўляць з ім. Уражанні вельмі моцныя», — падзялілася яна.

Школьніца дадала, што асабліва хвалявалася ў дзень, калі даведалася пра будучую сустрэчу з Аляксандрам Лукашэнкам. Потым супакоілася, але асаблівае трапятанне ў яе выклікаў момант перад самым уручэннем. «Далонькі пацеюць», — з усмешкай растлумачыла Дар'я.

Яна станоўча ацаніла і экскурсію па Палацы Незалежнасці, асабліва адзначыла асабісты кабінет кіраўніка дзяржавы. Дарэчы, першы асобнік дзейнай Канстытуцыі Беларусі знаходзіцца менавіта ў гэтым памяшканні. На яе думку, сам палац выдатна падыходзіць для мерапрыемстваў любога маштабу.

Вучань Глушанскага вучэбна-педагагічнага комплексу (Бабруйскі раён) Максім Пархімчык трапіў на гэтую цырымонію, таму што ён выдатна вучыцца і часта ўдзельнічае ў алімпіядах па фізіцы і матэматыцы.

Эмоцыі ад атрымання пашпарта ў хлопца выдатныя. «Толькі фатаграфія ў пашпарце, шчыра кажучы, не вельмі атрымалася, — жартам сказаў школьнік. — Але я вельмі рады, што Прэзідэнт асабіста ўручыў мне гэты дакумент. Вядома, такога я не чакаў. Калі я даведаўся, што кіраўнік дзяржавы будзе ўручаць мне пашпарт, я быў у шоку».

Вучаніца сярэдняй школы № 7 г. Барысава Ганна Кісялёва адзначыла, што адчувае гонар, радасць і шчасце ад таго, што трапіла ў Палац Незалежнасці і атрымала пашпарт ад Аляксандра Лукашэнкі. «Так пашанцавала, што менавіта нам — 25 з тысяч дзяцей, якія атрымліваюць дакумент, — выпала ўдача атрымаць пашпарт з рук кіраўніка дзяржавы. Мы запомнім гэтую падзею на ўсё жыццё», — сказала яна.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# Першыя пашпарты юным беларусам уручылі прадстаўнікі органаў улады

**Галоўны дакумент грамадзяніна ў Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці 24 падлеткі атрымалі з рук кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі КАЧАНАВАЙ.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Для ўдзельнікаў мерапрыемства падзея стала радаснай удвая — не кожны дзень можна наведаць будынак Адміністрацыі Прэзідэнта і павітацца з кіраўніком установы. Але гэта магчымасць для кожнага з іх — заробленая шанц. Удзельнікі акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!» — выдатнікі вучобы, удзельнікі навуковых канферэнцый, пераможцы спаборніцтваў, фестываляў, конкурсаў, алімпіяд.

Адметна, што ў беларускую сталіцу на святочнае мерапрыемства трапілі дзеці з усіх абласцей краіны.

«Я проста ўпэўненая, што гэты дзень запомніцца маладым людзям на ўсё жыццё. Будучыня краіны ў руках маладых, таму нам вельмі хацелася б, каб моладзь цаніла усё тое, што ёсць у Беларусі. За невялікі ў гісторыі прамежак часу наша краіна стала прыгожай і квітнеючай, яна вядомая на міжнароднай арэне. Мы бачым, з якой любоўю і трапятаннем да яе ставяцца самі беларусы. Адным з прыярытэтных напрамкаў палітыкі дзяржавы з'яўляецца праца з моладдзю. Прэзідэнт заўсёды ставіць сур'ёзныя задачы ў гэтым кірунку, падкрэсліваючы яго асаблівую важнасць, — сказала Наталля Качанава. — Дзе б вы ні былі і куды б ні выязджалі, вы павінны ведаць, што ў вас ёсць свая родная зямля, свой родны дом — Беларусь, і вы патрэбныя тут. Скончыўшы школу, атрымаўшы адукацыю і прафесію, якія вы для сябе выбераце, вы заўсёды зможаце тут рэалізавацца, у тым ліку ў сваім родным горадзе, вёсцы, раёне».

***

У святочны дзень запрасіў школьнікаў на Чырвонаармейскую, 9 і старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. Міхаіл Мясніковіч уручыў першы пашпарт 18 прадстаўнікам таленавітай моладзі з Гомельскай, Брэсцкай, Мінскай абласцей і сталіцы.

У акцыі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі «Мы — грамадзяне Беларусі!», прысвечанай Дню Канстытуцыі, прынялі ўдзел 3000 хлопцаў і дзяўчат з усёй краіны. У рамках падзеі адбылося 167 святочных цырымоній уручэння пашпартоў 14-гадовым падлеткам з рук кіраўнікоў заканадаўчай, выканаўчай улады і грамадскіх дзеячаў.

***

У Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці ў Мінску ўзнагародзілі пераможцаў конкурсу «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь».

Конкурс фатаграфій-матыватараў прымеркаваны да 25-годдзя прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. На суд кампетэнтнага журы было прадстаўлена каля 800 работ на тэмы: патрыятызм, Канстытуцыя, гістарычная спадчына, правы, свабоды і абавязкі грамадзяніна, беларуская нацыя, гісторыя народа і малая радзіма. Пры ацэнцы работ улічвалася адпаведнасць зместу фатаграфій заяўленай тэматыцы, кампазіцыйнае і каляровае рашэнне, мастацкі ўзровень работ, арыгінальнасць ідэі, стыль выкладання. Пераможцамі сталі 23 падлеткі, якія занялі першае, другое і трэцяе месцы ў розных намінацыях.

Найлепшыя работы дзяцей будуць адабраны ў навучальнае выданне для школьнікаў «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь».

**Марыя ДАДАЛКА, Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# Непахісныя прынцыпы і магчымасць удасканалення

**Учора ў абноўленай Авальнай зале Дома ўрада старшыня Канстытуцыйнага Суда Пётр Міклашэвіч агучыў Пасланне Канстытуцыйнага Суда Прэзідэнту Беларусі і Нацыянальнаму сходу «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2018 годзе».**

«Новая форма шырокага і адкрытага прадстаўлення Паслання Канстытуцыйнага Суда з'яўляецца важным элементам для пабудовы нашай дэмакратычнай дзяржавы, — сказаў у сваёй прамове падчас абмеркавання дакумента **спікер верхняй палаты парламента Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** — Савет Рэспублікі актыўна ўключаны ў працэс выпрацоўкі пазіцый суда па актуальных прававых пытаннях на ўсіх стадыях заканатворчасці, паміж намі наладжана зваротная сувязь, і наша ўзаемадзеянне накіравана на дасягненне агульных мэт — забеспячэнне канстытуцыйнай законнасці, больш поўную рэалізацыю патэнцыялу Канстытуцыі».

Беларускія законы з 2019 года будуць распрацоўвацца з пэўнымі навацыямі, якіх раней не было. Гаворка ідзе пра прагназаванне наступстваў прыняцця нарматыўных прававых актаў, уключаючы ацэнку іх уздзеяння на ўмовы вядзення бізнесу. Акрамя таго, з гэтага года заканадаўцы практыкуюць пакетны прынцып падрыхтоўкі праектаў законаў, што дазваляе павялічыць колькасць нормаў прамога дзеяння, скарацiць ведамасную нарматворчасць. Сярод важных інструментаў фарміравання сістэмы права, адэкватнай сучасным грамадскім патрэбам, спікер назваў навуковую экспертызу.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама звярнуў увагу на актуальнасць пытанняў суадносін нацыянальнага і наднацыянальнага права з улікам далейшага ўдасканалення права Еўразійскага эканамічнага саюза і саюзнага будаўніцтва Беларусі і Расіі. «Гэта новая функцыя і Нацыянальнага сходу, і Канстытуцыйнага Суда. Лічым, што любыя крокі па развіцці нашых ключавых інтэграцыйных аб'яднанняў — Саюзнай дзяржавы і ЕАЭС — павінны рабіцца пры захаванні суверэнітэту, незалежнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці, Канстытуцыі і іншых атрыбутаў дзяржаўнасці. Пры гэтым няўхільным павінен заставацца прынцып кансэнсусу ў прыняцці рашэнняў аб прасоўванні па шляху саюзнага будаўніцтва і ўліку нацыянальных інтарэсаў», — падкрэсліў кіраўнік верхняй палаты парламента.

Пра тое, што ўзаемадзеянне парламентарыяў з Канстытуцыйным Судом павінна пастаянна ўдасканальвацца, набываць новыя формы, гаварыў у сваім выступленні і **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.** «Мяркую, сённяшняе пашыранае абмеркаванне Паслання аб стане канстытуцыйнай законнасці — крок у абсалютна правільным кірунку, — сказаў ён. — Нам трэба рухацца далей, думаючы пра тое, як прывесці да адной роўніцы тыя дыскусіі, якія вядуцца і на парламенцкай пляцоўцы, і ў рамках Канстытуцыйнага Суда».

Такога роду сумесная праца ўяўляецца вельмі перспектыўнай як у плане ўдасканалення заканадаўства, так і для развіцця канструктыўнага дыялогу з грамадзянскай супольнасцю, лічыць кіраўнік дэпутацкага корпуса. «Публічнае абмеркаванне ўсіх прынцыповых пытанняў жыцця краіны павінна стаць няўхільным правілам, — падкрэсліў ён. — Дзяржава для народа — не лозунг, а адзіны магчымы шлях рэалізацыі каштоўнасцей, закладзеных у аснову Канстытуцыі. І мы павінны прыкласці максімум намаганняў, каб наша дзейнасць адпавядала патрабаванням кіраўніка дзяржавы і чаканням нашых грамадзян».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У новазеландскім Крайстчэрчы адбыўся расстрэл у мячэцях



Каля паўсотні чалавек загінулі ў выніку ўзброенага нападу на дзве мячэці ў новазеландскім горадзе Крайстчэрч. Дзясяткі цяжка параненыя. Трое падазраваных арыштаваныя. У ходзе паліцэйскай аперацыі канфіскаваны самаробныя выбуховыя прылады, агнястрэльная зброя і боепрыпасы. Мяркуючы па колькасці знойдзенай зброі, кажуць эксперты, напад на мячэці быў старанна падрыхтаваны. «Гэта адзін з самых чорных дзён у гісторыі Новай Зеландыі», — заявіла прэм'ер-міністр краіны Джасінда Ардэрн. Сярод ахвяр нападу, па яе словах, шмат мігрантаў, можа быць, нават бежанцаў. У інтэрнэце з'явілася відэа расстрэлу (забойца вёў прамую трансляцыю). Агенцтва France-Presse правяло лічбавую экспертызу відэа і пацвердзіла, што яно сапраўднае.

**«Гэты жудасны акт гвалту яшчэ раз даказвае неабходнасць самым рашучым чынам змагацца супраць любых праяў тэрарызму і нецярпімасці», — адзначаецца ў спачуванні, якое Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў генерал-губернатару Новай Зеландыі Пэтсі Рэдзі.**

## Дзярждэпартамент налічыў каля 50 краін, якія могуць нанесці шкоду ЗША

З адпаведнай заявай выступіла ў Цэнтры стратэгічных і міжнародных даследаванняў дырэктар аддзела палітычнага планавання Дзярждэпартамента ЗША Кіран Скінэр. «На сённяшні дзень існуюць каля 50 краін, якія выклікаюць наш непакой. І гаворка ідзе не толькі пра краіны, якія могуць нанесці масіўны ядзерны ўдар, але і пра тыя, што могуць нанесці шкоду ЗША з дапамогай кібервайны, эканамічнай вайны, інфармацыйнага супрацьстаяння. Гэта зусім іншы свет, — падкрэсліла яна. — Адным з самых галоўных выпрабаванняў для ЗША стануць краіны, якія развіваюцца. Калі вы разгледзіце апошнія некалькі дзесяцігоддзяў, то заўважыце, што такімі з'яўляюцца краіны, якія далучыліся або здольныя далучыцца да ядзернага клуба. Калі вы паглядзіце на іх дэмаграфію, то зразумееце, што гэта іншы свет».

## Стонхендж быў месцам масавых баляванняў

Археолагі выявілі сведчанні таго, што тысячы гадоў таму Стонхендж быў месцам грандыёзных масавых баляванняў, на якія з'язджаліся жыхары з усёй тэрыторыі Брытанскіх астравоў, у тым ліку з аддаленых рэгіёнаў Шатландыі. Зрабіць гэтае адкрыццё дапамаглі свіныя косткі, раскапаныя ў чатырох размешчаных паблізу паселішчах эпохі позняга неаліту. Свініна была галоўным пунктам святочнага меню, прычым наведвальнікі ўрачыстасцяў прыводзілі з сабой жывёлу, якую разводзілі ў сябе ў аддаленых раёнах, і закалвалі для балявання. Усяго былі выяўлены астанкі 131 жывёлы, узрост якіх складае каля 4500 гадоў. Гэта даказвае не толькі тое, што Стонхендж быў месцам масавага паломніцтва, але і той факт, што людзі, якія засялялі аддаленыя куткі Брытаніі тысячы гадоў таму, падтрымлівалі паміж сабой пастаянныя сувязі і рэгулярна падарожнічалі на значныя адлегласці.

Культпрастора

# «СЛАВЯНСКІ БАЗАР У ВІЦЕБСКУ» ЗБІРАЕ КАНКУРСАНТАЎ

**Заключны этап беларускага нацыянальнага адбору на міжнародныя вакальныя конкурсы «Славянскага базару ў Віцебску» пройдзе 16 сакавіка ў Оршы. За права прадставіць Беларусь на фестывальнай сцэне ў конкурсе выканаўцаў эстраднай песні і дзіцячым музычным конкурсе «Віцебск-2019» спаборнічаюць два дзясяткі прэтэндэнтаў, якія прайшлі папярэднія адборы ў рэгіёнах краіны.**

«Фестываль ставіць сваёй задачай развіццё культуры не толькі ў сталіцы, але і ў рэгіёнах, таму, на мой погляд, правесці гала-канцэрты адбораў на «Славянскі базар» па-за межамі сталіцы — вельмі добрая ідэя, — адзначыў **міністр культуры Беларусі Юрый БОНДАР.** — Калісьці мы пачыналі акцыю «Культурная сталіца Беларусі», сёння на конкурснай аснове гарады вельмі сур'ёзна спаборнічаюць, каб насіць гэта высокае званне. Таму варта і правядзенне гэтага адбору ў рэгіёнах зрабіць традыцыяй — прывозіць у розныя гарады прыгожае, відовішчнае шоу з удзелам зорак беларускай эстрады — а яны, паверце, у нас ёсць».

Дарэчы, у гэты ж дзень, 16 сакавіка, у Рызе адбудзецца першы аб'яднаны еўрапейскі адбор удзельнікаў на конкурс «Славянскага базару». У ім возьмуць удзел артысты з шасці краін: Латвіі, Літвы, Эстоніі, Германіі, Нарвегіі і Швейцарыі. Таксама, расказаў журналістам **кіраўнік Цэнтра культуры «Віцебск» і дырэктар фестывалю Глеб ЛАПІЦКІ,** упершыню вялікі нацыянальны адбор з удзелам 30 выканаўцаў правяла сёлета і Вялікабрытанія. А, напрыклад, на латвійскі нацыянальны адбор дарослага песеннага конкурсу ў Віцебску паступіла 98 заявак — уяўляеце, які аўтарытэт за гады правядзення набыў наш мастацкі форум за мяжой?.. Дакладная колькасць удзельнікаў сёлетніх музычных конкурсаў стане вядомая праз некалькі тыдняў, бо заяўкі ад іншых краін аргкамітэт прымае да 1 красавіка. А вось старшыня журы дарослага конкурсу ўжо вядомы — Тамара Гвердцытэлі.

Наогул, запэўніваюць арганізатары, 28-ы па ліку «Славянскі базар» будзе сучасны і цікавы самай шырокай аўдыторыі. У яго праграме з 8 да 17 ліпеня больш як 200 разнапланавых мерапрыемстваў, у тым ліку джазавыя ночы і КВЗ-праект ад зорак Вышэйшай лігі КВЗ і айчынных камандаў, лядовае шоу з Санкт-Пецярбурга і міжнародны фэст вулічнага мастацтва «На сямі вятрах», лялечны квартал і «Тэатральныя сустрэчы», спартыўныя спаборніцтвы і кругласутачны open air на плошчы Перамогі, агляд найлепшых беларускіх кавер-бэндаў і фестываль аўтагуку — словам, мноства навінак і традыцыйных, але ад таго не менш цікавых праектаў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# НОВЫ ІМПУЛЬС ДЛЯ ТРАДЫЦЫЙ

**Пры правядзенні Дня беларускага пісьменства неабходна павысіць статус гэтага свята, надаць яму сучаснае гучанне, злучыць традыцыі з сучаснасцю, знайсці новыя формы і падыходы. Аб гэтым заявіў на пасяджэнні нацыянальнага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**

Лейтматывам свята сёлета мусяць стаць некалькі тэм: Год малой радзімы, 75-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а таксама юбілеі класікаў беларускай літаратуры. Таму, паводле слоў віцэ-прэм'ера, канцэртная праграма адкрыцця мерапрыемства павінна стаць «не проста чарадой выступленняў беларускіх зорак і аматарскіх калектываў, рэжысёрска-пастановачнай групе неабходна стварыць сапраўдны спектакль». Акрамя таго, арганізатары плануюць шырэй выкарыстоўваць магчымасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, стэнд якой павінен стаць адной з цэнтральных тэматычных пляцовак.

Нагадаем, сталіцай 26-га па ліку Дня беларускага пісьменства ў першую нядзелю верасня бягучага года стане Слонім, жыхары якога па традыцыі не толькі атрымаюць падарункі: новыя сацыяльна-культурныя аб'екты і помнікі архітэктуры, рэканструяваныя дамы і вуліцы, абноўленыя зоны адпачынку, але і самі возьмуць удзел у добраўпарадкаванні горада і падрыхтоўцы інфраструктуры да прыёму шматлікіх гасцей.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## ЗАЎСЁДЫ НА СУВЯЗІ

**Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 16 сакавіка ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. З 9.00 да 12.00 у суботу іх правядуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Андрэевіч ДВОРНІК. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Андрэй Міхайлавіч КУНЦЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# СЯМЕЙНАЕ ДРЭВА

**У брэсцкім парку 1000-годдзя з'явілася алея маладых дрэў.**


Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Цікавую акцыю задумалі і правялі Брэсцкі абласны камітэт БРСМ разам з абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Яе назва «Парк сямейных дрэў». У прызначаны час сабраліся маладыя сем'і актыўных нераўнадушных гараджан і пасадзілі дрэўцы ў парку 1000-годдзя Брэста. Маецца на ўвазе, што бацькі разам з дзецьмі будуць прыходзіць сюды, даглядаць дрэўцы, потым перадаваць эстафету з пакалення ў пакаленне.

На першую акцыю-пасадку сабралася 11 сем'яў, сярод якіх былі людзі самых розных прафесій і роду заняткаў, напрыклад настаўнік, студэнт, работнік міліцыі, артыст. Маладых людзей падтрымалі ўдзелам у акцыі першы намеснік старшыні гарвыканкама Вадзім Краўчук, старшыня абласнога камітэта прыродных рэсурсаў Тамара Ялкоўская. Наступны этап акцыі пройдзе ў сакавіку — красавіку.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ХТО СА СТРЭЛЬБАЙ, ХТО — З АРБАЛЕТАМ

**У краіне пачынаюцца чарговыя сезоны палявання на дзічыну.**

З трэцяй суботы сакавіка (сёлета — 16-е) дазволена здабыча самцоў вальдшнэпа, якая будзе доўжыцца да другой нядзелі мая (12-е). Паляваць можна ў перыяд з 18 да 22 гадзін ружэйным спосабам з засады. Дазволена выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю і патроны са шротам. Дапускаецца мець паляўнічых сабак — тэр'ераў, такс, лягавых, спаніэляў, рэтрывераў, водных сабак.

З 20 сакавіка да 10 мая з 3 да 9 гадзін дазволена здабываць самцоў глушца і цецерука. Спосаб палявання — ружэйны на такавішчах, з падыходу і з засады. Можна выкарыстоўваць наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 400 джоўляў, гладкаствольную зброю з патронамі са шротам, паляўнічыя лукі і арбалеты пэўных параметраў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Падрабязнасці

# ЗА КРОК ДА ТРАГЕДЫІ

## Пацярпелых ад выбуху гранаты ў Печах выпішуць праз тыдзень

**14 сакавіка падчас вучэбных заняткаў у навучальным цэнтры ў Печах адбылося надзвычайнае здарэнне. Радавы тэрміновай службы выпусціў з рук у акоп гранату РГД-5. Кіраўнік заняткаў, камандзір 6-й вучэбнай мотастралковай роты 37-й гвардзейскай школы старшы лейтэнант Дзмітрый Філіповіч, выкінуў салдата з акопа і прыкрыў яго сваім целам. Абодва ваеннаслужачыя атрымалі раненні ў ногі. Увечары ў чацвер іх даставілі на лячэнне ў сталіцу.**

— Зараз стан пацыентаў стабільна здавальняючы, — кажа **палкоўнік медыцынскай службы, вядучы хірург медыцынскай часці 432-га галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра Аляксей ТРУХАН.** — Яны знаходзяцца пад назіраннем урачоў Рэспубліканскага цэнтра па лячэнні пацыентаў з агнястрэльнымі раненнямі і мінна-выбуховымі траўмамі. У нас ёсць усе ўмовы для лячэння.

Мяркуецца, што ў шпіталі пацыенты прабудуць каля тыдня, пасля чаго здолеюць працягваць ваенную службу. Раны ў іх паверхневыя, ніякай пагрозы для жыцця не ўяўляюць. Тыднёвая вытрымка неабходна таму, што ўсе агнястрэльныя раненні па змоўчанні лічацца інфіцыраванымі. Рызыка развіцця ўскладненняў пры іх вышэйшая. Таму пацыенты атрымліваюць антыбактэрыяльную тэрапію і за імі вядзецца назіранне.



...У руках Дзмітрыя Філіповіча — бронекамізэлька са слядамі ад удараў. Менавіта яна прыкрыла афіцэра ад асколкаў РГД-5. Але, на жаль, не да канца. Афіцэр кульгае, але стараецца трымацца бадзёра. Дома яго чакаюць жонка і двое дзяцей. Тэлефон яго ўчора не змаўкаў амаль да адбою.

— Гэта здарылася раніцай, — згадвае Дзмітрый Філіповіч. — Былі планавыя заняткі па кіданні наступальных і абарончых гранат. У маім падначаленні — 52 чалавекі. Давялося дзейнічаць па сітуацыі. Памятаю толькі, як я кінуўся на радавога. Першае, што прыйшло ў галаву, — ці цэлы салдат? Пра сябе неяк і не думаў. У падсвядомасці яшчэ з салдацкіх часоў быў алгарытм, як дзейнічаць, калі нешта падобнае здарыцца. Вось упершыню і давялося прымяніць гэта на практыцы. Праз паўгадзіны пасля таго, што здарылася, патэлефанаваў жонцы. Сказаў, што адбылося надзвычайнае здарэнне і што я жывы.

Старшы лейтэнант выратаваў радавога Паўла Бацяноўскага. Хлопцу 24 гады, ён родам з Мінска. Мае вышэйшую адукацыю — спецыяліст прамысловай справы, магістр кіравання і эканомікі. На тэрміновай службе прабыў зусім мала — яго прызвалі 26 лістапада. Трапіў у падпарадкаванне да Дзмітрыя Філіповіча. Афіцэр асобна падкрэслівае, што ўся складанасць практыкавання была ў тым, што граната баявая. Часам, калі яе бяруць у рукі салдаты, у іх пачынаецца мандраж. Так адбылося і ў чацвер.

— Я і сам не разумею, што ж магло пайсці не так, — кажа салдат. — Да таго мы кідалі вучэбныя гранаты. Баявую ўзяў у рукі першы раз. Зрабіў замах, а калі стаў кідаць, то зразумеў, што гранаты ў руцэ і няма. Спалохацца я не паспеў. Старшы лейтэнант адрэагаваў вокамгненна. За гэта яму велізарны дзякуй. Толькі пасля таго як усвядоміў, што магло здарыцца, быў у шоку.

Афіцэр і салдат знаходзяцца ў адной палаце. Кажуць, што доўга абмяркоўвалі тыя падзеі, якія прывялі іх на бальнічныя ложкі. Але відаць, што Павел Бацяноўскі вельмі разгублены і збянтэжаны...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**


**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 10.04.2019 повторного открытого аукциона**

Лот № 1. **Капитальное строение с инв. № 730/С-12526 – здание административно-хозяйственное** площадью 82,8 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская область, Кричевский р-н, г. Кричев, ул. К. Маркса, 13. Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 724050100002000491, площадь – 0,0528 га.

***Начальная цена продажи: 6 995,77 долларав США без учета НДС.***

***Сумма задатка: 699,58 долларав США.***

Валюта платежа: белорусский рубль с применением курса Национального банка Республики Беларусь на дату внесения платежа. Установленная в ходе аукциона цена продажи Объекта будет увеличена на сумму налога на добавленную стоимость (НДС 20 %) согласно законодательству Республики Беларусь

**Аукцион состоится 10 апреля 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Прием заявлений (только личная подача) и внесение задатка: по 09.04.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для внесения задатка:** Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** Туристско-экскурсионное дочернее унитарное предприятие «Туристско-гостиничный комплекс «Могилевтурист», УНП 790758001, г. Могилев, пр-т Пушкинский, 6

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Продавец и Победитель аукциона обязаны в течение 10 календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата за предмет аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счетах оплаты за предмет аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номере газеты «Звязда» от 08.08.2018 и 15.12.2018

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 222 72-41-14, +375 29 624-26-25, на сайте ino.by**



**К публикации Коммунального топографо-геодезического унитарного предприятия «ГОМЕЛЬГЕОДЕЗЦЕНТР» о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собсвтенность в г. Гомеле № 3-С/2019, который состоится 17 апреля 2019 г. (объявление опубликовано в газете «Звязда» 15.03.2019 г.) добавляется лот № 4 в следующей редакции**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Начальная стоимость, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Затраты на подготовку документации, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4 | По ул. Витебской 1-й, 68 (участок № 1) | 340100000002005951 | 0,0955 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Ограничений в использовании не имеет | 32 904,18 | 1 000,00 | 2 276,28 |

Лот № 4 выставляется на аукцион повторно, извещение опубликовано 18.07.2018 г. в газете «Звязда»

Контактный телефон +375 232 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by УНП 400230163

# СУВОРАВЕЦ — ГУЧЫЦЬ З ГОНАРАМ

**Сакавік для школьнікаў — той час, калі трэба вызначацца з выбарам будучай альма-матар. Хтосьці вырашае звязаць сваё жыццё з войскам яшчэ падлеткам і спрабуе паступіць у Мінскае Суворaўскае ваеннае вучылішча. Іншыя выбіраюць у ваенныя ВНУ або адпаведныя факультэты ў грамадзянскіх універсітэтах.**


Фота Андрэя САЗОНАВА.

Быць суворaўцам ва ўсе часы было прэстыжна. Конкурсны адбор у вучылішча істотны. Але і вучыцца там больш складана, чым у звычайнай школе — жорсткі рэгламент часу, спецыфіка вайсковых прадметаў і вялікая ўвага да фізічнай падрыхтоўкі. Паколькі большасць суворaўцаў звязвае сваю дзейнасць з сілавымі структурамі, то мяркуецца, што яны павінны быць усебакова развітыя. У тым ліку — і ў творчым складніку.

...**Яўген ДАВЫДОЎСКІ** родам са Стоўбцаў. Ён вучыцца ў суворaўскім другі год. Сёлета перамог у патрыятычным творчым конкурсе, які праводзіўся ў вучылішчы. Пісаў сачыненне па-беларуску.

— Мой дзед быў вайскоўцам, і гэта натхніла мяне на тое, каб самому стаць у армейскія шэрагі. Вось толькі паступіць сюды было вельмі няпроста. Спярша мы праходзілі медыцынскі агляд, пасля здавалі псіхалагічны тэст. А паколькі я вучыўся ў школе нядрэнна, то здаць іспыты па матэматыцы і мове было зусім няцяжка. Самае галоўнае, чаму я навучыўся за гэты час, — самастойнасці асабістага жыцця. Праўда, доўга ўцягваўся ў распарадак дня. Пад'ём — абавязкова а сёмай раніцы, нягледзячы ні на што. Пасля — зарадка, умыванне, прыбіранне ложка, снеданак — і ўрокі.

Сябе Яўген бачыць пасля вучылішча лётчыкам. Для гэтага ўжо цяпер на паглыбленым узроўні вучыць фізіку і матэматыку. Добрыя адзнакі заахвочваюцца — за поспехі ў вучобе хлопцаў узнагароджваюць звальненнем на выхадныя.

— Звычайна мы ходзім у звальненні раз на два тыдні. Крайні тэрмін для вяртання — пяць гадзін вечара ў нядзелю. Вядома, прыязджаюць і бацькі да мяне, але ўсётакі часцей я сам езджу ў Стоўбцы. І часам лаўлю позіркі на сабе, калі іду ў форме дадому з вакзала. Але нават калі звальнення няма, то для нас створана шырокая культурная праграма. Кожны раз мы абавязкова кудысьці ходзім — у музеі, паркі, на выстаўкі...

З Вячаславам Дзергачовым, які таксама вучыцца на другім курсе суворaўскага, мы гутарым па-беларуску. Хлопец раней вучыўся ў беларускамоўнай гімназіі ў Чэрвені, падцягваў свае веды самастойна.

— Аднойчы ўвечары я сёрфіў па інтэрнэце. І вось убачыў недзе аб'яву, што прыкладна праз месяц у суворaўскім вучылішчы будзе дзень адкрытых дзвярэй. Адразу пачаў распытваць дзядулю і бабулю, ці былі ў маёй сям'і ваенныя. Даведаўся, што толькі мой прадзед ваяваў падчас Вялікай Айчыннай. І так я вырашыў, што буду першым ваенным у сям'і. З розных крыніц здабываў інфармацыю аб тым, як туды паступаць і як там вучацца. Давялося падцягваць фізічную падрыхтоўку. Напрыклад, раней у мяне былі цяжкасці з падцягваннямі. Цяпер жа для мяне падцягнуцца адзінаццаць разоў — проста. Бацькі паставіліся да майго выбару станоўча, але папрасілі сур'ёзна ўзважыць усе «за» і «супраць».

Да нас перыядычна прыходзяць з вышэйшых ваенных навучальных устаноў і расказваюць пра вучобу ў іх. Больш за ўсё мяне вабяць проціпаветраная абарона і сілы спецыяльных аперацый. На гэта паўплывалі многія фільмы. Але я разумею, што там вучыцца вельмі няпроста. Мы пастаянна займаемся баявой падрыхтоўкай. Напрыклад, акрамя страявой, мы ходзім у цір, страляем з аўтаматаў або пісталетаў. На гадзіну практыкі прыпадаюць дзве тэорыі.

**Міхаіл ПЕЧУРОЎ,** які паступіў у вучылішча летась, — суворавец у трэцім пакаленні. Тут вучыліся яго дзед і бацька. Пазней яны сталі мотастралкамі. У гэтай спецыяльнасці бачыць сябе і Міхаіл.

— Я ведаю тактыка-тэхнічныя характарыстыкі аўтамата Калашнікава, пісталета Макарава. Навучыўся збіраць і разбіраць іх. Ды і прадметы выкладаюцца на зусім іншым узроўні, чым у школе. Таму патрабаванні больш жорсткія. А яшчэ дзейнічае сістэма залікаў! На самастойную падрыхтоўку нам адводзіцца тры гадзіны. Калі не падрыхтуешся — то атрымаеш дрэнную адзнаку і аўтаматычнае пазбаўленне звальнення.

Напрыклад, у звычайнай школе нам ставілі адзнакі па фізкультуры за тое, што мы гулялі ў футбол. Тут жа — поўны комплекс. Залік па фізкультуры мы здаём кожныя два тыдні. У яго ўваходзяць падцягванне, скачок у даўжыню, адцісканне, вольныя практыкаванні...

Наступны дзень адкрытых дзвярэй у Суворaўскім вучылішчы пройдзе 23 сакавіка.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Перспектывы

# ШТО ЗМЕНІЦЦА Ў СІСТЭМЕ ВАЕННАЙ АДУКАЦЫІ?

**Да пачатку ўступнай кампаніі застаецца зусім няшмат часу. Цэнтралізаванае тэсціраванне пачнецца ўсяго праз тры месяцы. Напярэдадні гэтага ў Мінабароны расказалі пра змены, якія адбудуцца ў сістэме ваеннай адукацыі.**

## ВАЕННЫЯ КАФЕДРЫ СТАНУЦЬ АГУЛЬНЫМІ?

У буйных універсітэтах з савецкіх часоў захаваліся ваенныя кафедры. У студэнтаў яны вельмі папулярныя. Яно і нядзіўна — навучанне на кафедры залічваецца ў тэрмін ваеннай службы пасля атрымання дыплома. Прычым тут ёсць аж два варыянты.

Калі студэнт вучыўся на такой кафедры адзін год, то тэрмін яго службы пасля атрымання дыплома скароціцца да шасці месяцаў, паколькі ваенную спецыяльнасць ён ужо атрымаў. Калі ж ён пераходзіць на другі год па жаданні, стане здароўя і высокай паспявальнасці, то пасля заканчэння навучання яму прысвойваецца званне лейтэнанта запасу. Але калі ваеннай кафедры ў альма-матар няма, то і выбару ў студэнта таксама няма, — стаўшы дыпламаваным спецыялістам, ён адпраўляецца спасцігаць ваенную навуку ў армію на год. Калі, вядома, яго прызнаюць прыгодным да службы. Гэты крытэрый, а таксама паспяховасць і з'яўляюцца краевугольнымі падчас залічэння на ваенныя кафедры.

— Цяпер у Міністэрстве адукацыі прапрацоўваецца праект указа аб сетказай падрыхтоўцы, — адзначыў **начальнік упраўлення ваеннай адукацыі Мінабароны Ігар СЛУЦКІ.** — Ён дазволіць навучаць студэнтаў не толькі той ВНУ, дзе ёсць ваенная кафедра як штатная структура, але і іншых


Фота БелТА.

устаноў адукацыі. Справа ў тым, што адкрыць ваенную кафедру ў кожным універсітэце праблематычна і вельмі дорага.

Такая схема ўжо паспяхова зарэкамендавала сябе ў Расіі. Чакаецца, што на подпіс кіраўніку дзяржавы дакумент паступіць сёлета. Але змяненні закрануць і тыя ваенныя кафедры, якія ўжо працуюць ва ўніверсітэтах. Заняткаў адчувальна прыбавіцца.

— Мы ўнеслі змены ў сумесную пастанову міністэрстваў абароны і адукацыі аб парадку работы ваенных навучальных устаноў па падрыхтоўцы афіцэраў запасу і малодшых ваенных камандзіраў, — працягвае Ігар Слуцкі. — Час навучання павялічыцца да 200 гадзін. Гэта значыць, набор на ваенныя кафедры будзе пачынацца на паўгода раней. Колькасць месяцаў будзе вызначацца, зыходзячы з патрэбнасці.

Штогод прызыў закранае сто афіцэраў запасу, якія правучыліся два гады на ваеннай кафедры. Цікава, што прыкладна трэць з іх застаецца на кантрактную службу.

А вось ці будуць студэнтаў падчас летніх вакацый адпраўляць на зборы, пакуль невядома. Будучым летам гэтага не будзе дакладна.

— Такая прапанова нам пакуль не паступала, — сцвярджае Ігар Слуцкі. — Але калі і з'явіцца, то вырашацца будзе далёка не адным ведамствам. Мабыць, гэта работа нават не аднаго года.

## ЛІЧБЫ НАБОРУ ВЫЗНАЧАЦЬ У САКАВІКУ

Цяпер вярстаецца праект загада міністра абароны, дзе фарміруюцца кантрольныя лічбы набору. Да 1 красавіка гэты загад будзе падпісаны. Там дакладна будуць пазначаны колькасныя паказчыкі па кожнай спецыяльнасці, спецыялізацыі, кірунку спецыяльнасці. Яны будуць выкладзены ў адкрыты доступ. Тады ж будзе вядома, ці чакаць сёлета набору дзяўчат у Ваенную акадэмію.

Прыём дакументаў ад абітурыентаў, якія жадаюць паступаць у ваенныя навучальныя ўстановы Беларусі, пачаўся ў ваенкаматах з 1 студзеня. Пакуль што ідзе папярэдні прафесійны адбор. Па яго выніках 11 красавіка стартуе канчатковы адбор. І толькі тыя, хто прайшоў праз гэтую працэдуру, пойдуць здаваць уступныя іспыты.

## ЭКСПАРТ І ІМПАРТ АДУКАЦЫІ

Таямніцы вайсковай навукі спасцігаюць у Беларусі і курсанты-іншаземцы. Напрыклад, за 24 гады існавання Ваеннай акадэміі праз яе прайшлі амаль паўтары тысячы замежнікаў. Геаграфія даволі шырокая.

— Асноўныя краіны — Венесуэла, Казахстан, В'етнам, Кітай, — пералічвае **намеснік начальніка па вучэбнай рабоце Ваеннай акадэміі Уладзімір СУША.** — Тыя спецыялісты, якія рыхтаваліся ў краінах сацыялістычнага лагера ў свой час, дасягнуўшы кіруючых пасад, памятаюць пра сістэму падрыхтоўкі, таму адпраўляюць сваіх падначаленых да нас і цяпер.

А вось беларускія вайскоўцы навучаюцца ў межах АДКБ толькі ў Расіі. І зрабіць гэта можна хіба па кантракце, які заключаецца па дамоўленасці паміж міністэрствамі абароны дзвюх краін. Вучыцца такім чынам няшмат курсантаў — усяго каля 400 чалавек. Ды і тое па спецыяльнасцях, па якіх навучанне ў Беларусі эканамічна немэтазгоднае з-за вельмі малой колькасці слухачоў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Асоба

# ЗОРКІ МАРЫТЭ МЕЛЬНІКАЙТЭ

**У Цэнтральным раёне Мінска размешчана вуліца, на якой знаходзіцца дом № 1, з усталяванай на ім мемарыяльнай дошкай з надпісам: «Гэта вуліца названая імем Героя Савецкага Саюза Мельнікайтэ Марыі Іозаўны, дачкі літоўскага народа, сакратара падпольнага павятовага камітэта камсамола ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі. Па-зверску закатавана фашыстамі ў ліпені 1943 года». Хто ж яна, гэтая мужная камсамольская актывістка з Прыбалтыкі, чыё імя носіць вуліца сталіцы Беларусі?**



...Марыя (Марытэ) Мельнікайтэ нарадзілася 18 сакавіка 1923 года ў небагатай шматдзетнай сям'і рускай маці і бацькі-літоўца ва Усходняй Літве, у адной з найпрыгажэйшых мясцін краю — у прадмесці горада Зарасай. З чатырнаццаці гадоў Марыя пачала сваю працоўную біяграфію ўпакоўшчыцай на мясцовай цукерачнай фабрыцы. Таварышы па рабоце паважалі яе, любілі за спагадлівасць, за вясёлы нораў, шчырасць, за тое, што ўмела захапіць наваколных карысная справай, натхніць на пераадоленне цяжкасцяў.

Летам 1941 года тэрыторыя Літвы была імкліва акупавана немцамі. Друкаваны орган ЦК Кампартыі Літвы газета «Tiesa» ў тыя дні пісала: «Усё часцей масы падымаюцца на барацьбу з немцамі. Рост антыгітлераўскіх агрэсіі... арганізацый у гарадзе і вёсцы, узмацненне партызанскага руху — усё гэта паказвае, што асноўная частка літоўскага народа стала на шлях барацьбы з ворагам!»

Летам 1941 года Марыя разам з іншымі літоўскімі камсамольцамі пакінула Літву, занятую гітлераўцамі, і была эвакуявана ў расійскі старажытны прамысловы горад Цюмень, дзе адразу пачала працаваць у лясной гаспадарцы. Крыху пазней перайшла на заводскую будоўлю, а затым была накіравана токарам на завод «Механік», дзе выраблялі міны і снарады. Неўзабаве камсамольскі сход ваеннага прадпрыемства аднагалосна выбраў Мельнікайтэ членам цэхавага камітэта камсамола.

У 1942 годзе Марытэ напісала заяву ў ваенкамат: «Хачу сваімі рукамі помсціць ворагу, помсціць за ўсе пакуты, якія ён прычыніў маёй любімай Радзіме». Просьбу літоўскай камсамолкі задаволілі, і дзяўчыну накіравалі ў горад Балахна Горкаўскай вобласці на курсы разведвальна-дыверсійнай школы 16-й Літоўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі, якой камандаваў генерал-маёр Феліксас Балтушыс-Жэмайціс. У школе ўлічвалася, што большасць добраахвотнікаў не ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях, ды і наогул не мелі якой-небудзь ваеннай падрыхтоўкі. У спецроце, куды былі залічаны Марытэ і яе сяброўка-землячка Валянціна Касцінайтэ, байцы ў класах праходзілі тэорыю вядзення партызанскай вайны, вывучалі аўтаматы, пісталеты і кулямёты, розныя выбуховыя прыстасаванні, на практыцы ў полі вучыліся майстэрству «рэйкавай вайны». Заняткі праводзіліся з пастаяннымі знясільваючымі марш-кідкамі і стральбой са стралковай зброі розных сістэм на палігоне. Да вечара дзяўчаты так стамляліся, што, прыйшоўшы ў казарму, літаральна валіліся з ног.

Вясной 1943 года для дзвюх дзяўчат з Прыбалтыкі закончыліся гэтыя цяжкія шматгадзінныя заняткі па ваеннай падрыхтоўцы ў спецроце — Марытэ і Валя сталі сапраўднымі воінамі Чырвонай Арміі. Цяпер яны ўмелі скакаць з парашутам і весці бой у тыле ворага, бегаць кросы, пускаць пад адхон чыгуначныя саставы ворага. На пастаенні ім было абвешчана аб заканчэнні курсаў, па выніках якіх яны з гонарам вытрымалі нялёгкія выпрабаванні і вартыя называцца воінамі — дэсантнікамі спецыяльных войскаў асобага прызначэння. У адну з летніх начэй усёй групай з ваеннага аэрадрома Балахна выпускнікі спецкурсаў вылецелі на захад і былі перакінуты ў тыл ворага на тэрыторыю акупаванай Беларусі. Былы камандзір партызанскага атрада імя Костаса Калінаўскага, Герой Савецкага Саюза Браніслаў Вікенцьевіч Урбанавічус успамінаў: «У пачатку мая 1943 года 36 літоўскіх юнакоў і дзяўчат накіраваліся ў Літву, каб змагацца з гітлераўцамі. Падчас гэтага амаль чатырохсоткіламетровага рэйду па тыле ворага Марытэ не скардзілася, хоць ёй было вельмі цяжка. Яна стойка пераносіла ўсе нягоды разам з мужчынамі, ішла з цяжкім грузам рыштунку за плячыма, з аўтаматам у руцэ і гранатамі на рамяні. Здавалася, што вяртанне ў родныя мясціны дало ёй невычэрпную сілу».

Прабраўшыся ў Літву, партызанская група накіравалася ў Зарасайскі павет, дзе Марытэ ўдзельнічала ў баявых дзеяннях у складзе партызанскага атрада імя Кястуціса, камандзірам якога з'яўляўся І. Васілюс. Партызаны пускалі пад адхон варожыя цягнікі з ваеннай тэхнікай, падрывалі склады, здзяйснялі налёты на гарнізоны праціўніка, палілі маёнткі і гаспадаркі, захопленыя гітлераўскімі каланістамі. Танклявая 20-гадовая дзяўчына вылучалася храбрасцю і вынаходлівасцю, была ў атрадзе самым актыўным байцом: удзельнічала ў шматлікіх баявых аперацыях, дыверсіях, хадзіла ў разведку, вяла вялікую агітацыйную работу сярод жыхароў.

У Зарасайскім павеце Марытэ з дапамогай таварышаў арганізавала некалькі камсамольскіх падпольных груп, пад імем Она Куасайтэ яна ўзначаліла Зарасайскі падпольны павятовы камітэт камсамола Літвы. Камсамольцы помсцілі фашыстам за сваю зняволеную зямлю, за зняважаны гонар, за смерць родных і блізкіх.

8 ліпеня 1943 года Мельнікайтэ разам з пяццю партызанамі ідзе на выкананне чарговага баявога задання. У родным Зарасайскім краі ў Рымшыёнскай валасці ў вёсцы Рудзе вялікі карны атрад гітлераўцаў высачыў групу партызан з шасці чалавек, сярод якіх была і Марытэ Мельнікайтэ. У аповедзе «Марыя Мельнікайтэ» народны пісьменнік Літоўскай ССР, член ВКП(б), лаўрэат Сталінскай прэміі Антанас Венцлава піша: «У гаі каркнікі акружылі партызан і прыціснулі да цяжкапраходнага яра... Няма шляху да адступлення — з усіх бакоў ворагі. І група літоўскіх партызан, натхнёная адважнай дзяўчынай, на працягу цэлага светлавога дня вядзе гераічную барацьбу з сіламі, якія нашмат пераўзыходзілі іх. У няроўнай барацьбе гінуць адзін за адным смерцю храбрых яе таварышы. Марытэ змагаецца да апошняга патрона. Ад яе рукі знаходзяць смерць сем фашысцкіх катаў. Калі скончыліся патроны, Марытэ адкінула аўтамат і кінула ў акружыўшых яе ворагаў гранату, ад якой загінула яшчэ некалькі гітлераўцаў. У наступнай гранаты параненая камсамолка збіралася выняць кальцо і падарваць сябе разам з ворагамі, але нямецкі афіцэр сілай вырваў зброю з рук акрываўленай дзяўчыны... Марытэ была паранена, захоплена ў палон, на допыце яна не прамовіла ні слова, пасля пяцідзённых пакутлівых катаванняў 13 ліпеня 1943 года яе расстралялі...

Падводзячы вынікі партызанскай барацьбы, ЦК Кампартыі Літвы ў сваім звароце да працоўных рэспублікі пісаў: «Слаўныя сваімі доблеснымі справамі партызаны Каўнаса, Шаўляя, Укмерге, Уцены. Бясстрашная партызанка і арганізатар камсамольскага падполля, беззапаветна адданая Радзіме Марыя Мельнікайтэ нават перад тварам смерці захавала жалезную стойкасць!»

За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання ў тыле ворага Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 сакавіка 1944 года Марытэ Іозаўне Мельнікайтэ пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

